*Алена Боганева*

# БЕЛАРУСКІЯ ЛЕГЕНДЫ ПРА ЧАРАПАХУ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ КАСМАГАНІЧНЫХ МІФАЎ

Вобраз чарапахі з’яўляецца міфалагічна і сімвалічна насычаным у традыцыйнай культуры многіх народаў свету, у тым ліку і ў фальклоры беларусаў. Знешні выгляд і біялагічна-марфалагічныя асаблівасці чарапахі, у прыватнасці, наяўнасць моцнага панцыра – «чэрапа», «прыплюснутасць», здольнасць вытрымліваць нагрузкі, якія ў сотні разоў перавышаюць уласную вагу, «змяіная галава», абітанне побач з воднымі асяродкамі, абумовіла функцыянальнасць міфапаэтычнага вобразу. Усходнія славяне ведаюць такую разнавіднасць чарапахі, як Еўрапейская балотная (Emys orbicularis). У прыродных умовах яна сустракаецца ў арэале ад Паўночна-Заходняй Афрыкі і Паўночнага Ірана на поўдні да паўднёвай часткі Беларусі – Цэнтральнага Палесся – на поўначы. У традыцыйных культурах розных народаў выдатна ўсведамляецца і асэнсоўваецца біялагічная «прамежкавасць» чарапахі паміж амфібіямі і птушкамі, у выніку чаго чарапаха і жаба з’яўляюцца ўзаемазамяняльнымі істотамі ў многіх міфах і легендах, а паходжанне чарапахі ва ўсходнеславянскіх легендах часта звязваецца з крылатай змяёй.

Чарапаха з’яўляецца распаўсюджаным персанажам у касмагоніях розных народаў Еўразіі і індзейскіх плямёнаў Паўночнай Амерыкі. У касмаганічных міфах функцыя чарапахі – служыць апорай зямлі і яе ўвасабленнем. Так як Сусвет – «рэч» груваcткая і цяжкая, яго апора павінна быць адпаведнай па магутнасці і габарытам і валодаць звышнатуральнымі якасцямі. Вельмі часта ў ролі такой апоры сусвету выступае касмічная чарапаха, якая або трымае на сябе зямлю, або яе панцыр разглядаецца як купал неба на плоскай зямлі [1, 251–279]. Вялікую ролю касмічная чарапаха адыгрывала ў міфах Старажытнай Індыі. Згодна «Шатапатха-брахмане», Праджапаці — творца ўсяго існага — аднойчы ўвасобіўся ў чарапаху, якая нарадзіла ўсе жывыя істоты [2, 24–25]. У індуізме лічылася, што на спіне вялізнай чарапахі, якая апусцілася на дно мора, размешчана гара Мандара, вакол якой абвіваецца змей Шэша, за адзін канец якога цягнуць богі, за другі дэманы (асуры). Богі і асуры сумесна пахтаюць акеан, каб дабыць з яго амрыту — напой неўміручасці [3, 536]. У мангольскай міфалогіі чарапаха фігуруе ў архаічным міфе першатварэння зямлі. Чарапаха рухалася ў напрамку з поўначы на поўдзень і была забіта асілкам, які стрэліў у яе з лука. Страла захраснула ў яе целе, а сама яна перавярнулася на спіну і памёрла. З апярэння стралы стаў лес. З памёршай чарапахі вылілася вадкасць, якая стала морам — то быў паўночны бок. З яе пасткі вырывалася полымя, таму месца, дзе была яе галава, назвалі паўднёвым бокам. У лапах чарапахі былі кавалачкі зямлі, з якіх стварылася глеба і ўсё, што на ёй расце [4, 26]. У старажытнакітайскай карціне свету ёсць першабытная жывёла АО — марская чарапаха касмічных памераў, на спіне якой знаходзіцца зямля. Яна падтрымлівае зямлю, а яе чатыры нагі размешчаны на чатырох канцах зямлі. У японцаў чарапаха падтрымлівае прыстанкі несмяротных
і Сусветную Гару і азначае доўгае жыццё, поспех і падтрымку [5].

За межамі Азіі міфы пра сусветную чарапаху распаўсюджаны перш за ўсё ў Паўночнай Амерыцы. Згодна паданню іракезаў і іншых індзейскіх плямёнаў (усяго налічваецца 10 разнавіднасцей гэтага сюжэта) у самым пачатку светасатварэння галоўнае боства вырашыла пасадзіць у першасным акіяне гіганцкае дрэва. Але для дрэва патрэбна была апора, і жывёлы, сабраўшыся на савет, вырашылі дастаць з дна акіяна зямлю. Нырцом за зямлёй стала чарапаха. Чарапаха дастала зямлю, але ўслед паўстала пытанне, на чым замацаваць зямлю? Гэта адказная місія была ўскладзена зноў жа на чарапаху. На яе магутны панцыр паклалі кавалачкі глея з дна акіяна, якія паступова разрасліся і ўтварылі сушу [6] .

Тыпалагічна падобны сюжэт, дзе ў працэсе стварэння света фігуруе «нырэц за зямлёй», існуе і ў беларусаў, толькі замест чарапахі зямлю з дна мора дастае нячысцік, а Бог робіць сушу з гэтай зямлі. У гэтым беларускім сюжэце нячысцік аддае не ўсю прынесеную з дна мора зямлю, а утайвае частку ў сябе ў роце. Але як і зямля, якая рассейваецца па вадзе Богам, гэта частка зямлі ў роце ў нячысціка пачынае расці; нячысцік імкнецца пазбавіцца ад яе і выплёўвае утоеную зямлю. «Куды толькі пляваў чорт, там і стала вадзяная зямля з дзярэўямі і травой. Дык во як балоты!..» [7, 35 – 37]. У сувязі з тым, што матыў «нырца за зямлёй» (у якасці нырца ў розных народаў могуць выступаць чарапаха, водаплаваючая птушка і іншыя персанажы) шырока распаўсюджаны у розных народаў еўразійскага кантыненту, але адсутнічае ў Афрыцы, Аўстраліі, Акеаніі і на большай частцы Паўднёвай Амерыкі, існуе вялікая верагоднасць, што яго шматлікія еўразійскія і паўночнаамерыканскія версіі генетычна звязаны [1, 251–279].

Персанажы гэтых версій, у прыватнасці, чарапаха ў паўночнаамерыканскай і нячысцік у беларускай (апошняя адносіцца ў сваю чаргу да т. зв. «паўночнай» славянскай лакальна-этнічнай версіі [8, 68]) узаемна карэліруюць, пры тым, відавочна, што генетычна больш ранні персанаж — чарапаха. Не выключана, што беларуская легенда прадстаўляе сабой пераасэнсаваную ў сувязі з монатэістычным светаўспрыманнем познюю версію старажытнага касмаганічнага міфу, вядомага на тэрыторыі Еўразіі і Паўночнай Амерыкі. Гэта тым больш верагодна, што еўрапейскі міфалагічны сімвалізм і канатацыі (і ў народнай, і пісьмовай культурах), звязаныя з вобразам чарапахі, амбівалентныя. Так, у хрысціянскім сімвалізме чарапаха прадстаўляе сабой «грахоўнае цела» (параўнаем са старажытнакітайскім прадстаўленнем юрлівасці і блудлівасці чарапахі, адсутнасці ў яе пачуцця сораму), а ў алхіміі «нерасчлененую масу», інэрцыю, марудлівасць, матэрыялістычныя складнікі быцця [9].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чарапаха ў розных міфалогіях з'яўляецца сімвалам мудрасці, пра што сведчаць шматлікія барэльефы і выявы, а таскама сімвалам павольнасці жыцця, плаўнага яго цячэння. Чарапаха асацыіруецца з усім ціхаходным, трывалым, стабільным, а з негатыўнымі канатацыямі – косным, аморфным, непаваротлівым, што, у прыватнасці, адлюстроўвае беларуская прымаўка «паўзе, як чарапаха».

Ва ўсходнеславянскіх казках чарапаха выступае то як увасабленне невыноснай марудлівасці (СУС 288 С*), то як сімвал кемлівасці і разумнасці (СУС 275). У першым сюжэце жывёлы дасылаюць чарапаху да Бога прасіць дажджу, а праз два месяцы знаходзяць яе амаль на тым жа месцы, дзе яе пакінул; у другім — чарапаха выступае пераможцам у спаборніцтве на хуткасць с зайцам або з лісіцай з-за сваёй хітрасці: яна прычэпліваецца да хваста лісіцы або пры дапамозе другой чарапахі сустракае сваіх сапернікаў на фінішы. У славян вобраз чарапахі таксама задзейнічаны ў касмалагічных міфах. Так, у балгарскай міфалогіі чарапаха трымае на сябе ўсю зямлю: зямлю падпірае вол, які стаіць на рыбе, што плавае ў моры; мора пакоіцца на ветры, а вецер на чарапасе [10, 393–394].

У беларускіх касмалагічных прадстаўленнях чарапаха адыгрывае ролю светаўтрымальніка нараду з вялізарнай рыбай, трыма кітамі, курачай нагой [11, 31–32]: «*<На чым свет стаіць?> На чэрэпасе. <На чэрэпасе, казалі, зэмля? А як гэта? Чэрэпаха дзяржыт?> Чэрэпаха дзяржыт. Ана круціцца, зямля, круціцца, старыя бабы казалі... <Круціцца яна? А якая яна, круглая? Ці плоская?> Круглая, казалі. Круглая і круціцца. На чэрэпасі. <А неба як дзержыцца?> А небо вжэ як дзержыцца... Кажуць, як будзе кончына сьвету, то воно вжэ упадзе. І всех ужэ...»* [12, 373].

У славян, як і ў іншых народаў свету, на моўным і міфалагічным узроўнях чарапаха таксама выяўляе найбольшую блізкасць з жабай і змяёй. Украінскія дыялектныя назвы чарапахі яскрава сведчаць пра гэта — коритна жаба, жаб'яча покришка, костена жаба і да т. п. Як і у жаб, у чарапах па славянскіх уяўленнях, маецца сувязь з дажджом, громам і градам. Так, у сербаў, каб не баяцца грому, ядуць яйкі чарапахі; у балгар лічаць, што забойства чарапахі выклікае град, а калі яе перавярнуць, то пойдзе дождж (параўнаем:
у беларусаў вельмі распасюджана павер'е, што забойства жабы выклікае дождж). Пра паходжанне чарапахе існуе мноства варыянтаў этыялагічных легенд. Распаўсюджаны яны ў украінцаў і ў беларусаў-палешукоў беларускага Цэнтральнага і Усходняга Палесся. Пра паходжанне чарапахі існуюць наступныя этыялагічныя сюжэты славянскіх легенд. Адзін з шырокараспаўсюджаных сюжэтаў апавядае, што ў чарапаху ператварылася якая-небудзь страва (яешня, варэнікі, хлеб з курыцай), якой гаспадыня з-за сваёй прагнасці не пачаставала старца (Хрыста), прыкрыўшы гэту страву міскай (Украіна) [13, 161]. Другія сюжэты аб паходжанні чарапахі: «з самага хітрага чорта» (Украіна) [14, 70]; з ведзьмы, што мыла бялізну ў свята і накрылася ночвамі ад людзей, якія йшлі ў царкву (Украіна) [13, 161]; з жанчыны, якая схавалася ад грому пад ночву замест таго, каб хрысціцца (Беларусь) [15, 161].

У апошнія гады на Цэнтральным Палессі былі запісаны наступныя версіі легендарных сюжэтаў пра паходжанне чарапахі. Чарапаха была крылатай і ў яе не было панцыра, яна садзілася людзям на галавы і паядала іх, пакуль пакуль Бог не накрыў яе чэрапам: «*У нас чарапаха, значыць. Ну чарапаху Бог саздаў, таму што Он яе накараў. Того шо у неё чэрап. Она сільно врэдная чэрэпаха. Она... В ее былі крыла і она нападала на людзей, і дажа сядала на голаву і мозгі выедала. Так сталі жаліцца Богу, а Бог ей даў за тое, шо она стала на людзей нападаць... І Бог ей даў таку кару, шоб она, значыць, носіла чэрапа. А в неё былі крыла і она летала. <Яна стала чэрап насіць, які клявала?>...Да, да. З крыламі лятала за людзьмі і нападала на людзей...<...> Гэта покойна моя мама расказывала* (*Зап. А. М. Боганева ў 2004 г. ад Ніны Сямёнаўны Ганчар 1933 г. н., 4 кл., в. Баклань Петрыкаўскага р-на)»*. [16]

Чарапаха паходзіць з удава (гадзюкі), што паядалі людей: «*Колісь булі этые удавы. Во такіе ведзьмы повзалі... Во догоне чоловека — уб'е. І вельмі людзей багато знічтожылі. Прама лятала, на людзей налятала і ела. ... А потым Бог наслав на ее чэрэпка, дав ёй чэрэпок на сьпіну, шоб вона не летала. І бач яка ў яе галава — як у гадзюкі. І ёй дав чэтыры ногі — на чэтыры ж ногі она — і чэрэпок такі велікі. Ёй не дав Бог, шоб вона летала і людзей ела. А ў ее подо дном чэрэпок і звэрху. (зап. у 2004 г. ад Анастасіі Уладзіміраўны Астаповіч 1931 г. н., 2 кл. в. Дубічы Лельчыцкага р-на)»*. [16]

Чарапаха — з жанчыны-пляткаркі, якую Бог накрыў чэрапам, каб глядзела толькі сябе пад ногі, а не па баках: «*То была вельмо такая ябедная ці то жэншчына, ці хто.. Так Бог яе накараў етым чэрапам. Налажыў на яе чэрап, каб яна нікуда не <глядзела>. Ад яе завісці, ад усяго... Так даў ёй чэрап, каб яна нікуда не двігалася, каб яна толькі перад сабою бачыла. Это я чула некалі такую байку, а што гэта за байка? От толькі свае глядзі. (зап. у 2005 г. ад Ніны Арцёмаўны Краснай 1939 г. н., мясц., прав., 8 кл., в. Санюкі Ельскага р-на)»* [16].

Ва ўсіх варыянтах гэтага сюжэту ёсць адзін агульны момант: Бог у пакаранне накрывае першапачатковую істоту чэрапам. У выніку ад крылатай змяі застаецца толькі галава і шыя (у чарапахі галава і зараз «дакладная, як у зьмяі»), а жанчына-пляткарка пазбаўляецца магчымасці глядзець на іншых, а толькі сабе пад ногі.

У маргінальнай зоне сюжэт пачынае згортвацца ва ўстойлівы выраз, яшчэ досыць блізкае і вядомае па дачыненні да сюжэту, а на больш далёкіх межах ператвараецца ў ідыёму. Так, у в. Маканавічы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобласці (крайняя паўднёва-заходняя кропка раёна, блізкая да Цэнтральнапалескай зоне) існуе праклён «А каб цябе Бог чэрапам, як чарапаху, накрыў!» Пры гэтым уласна легенду аб чарапасе носьбіты традыцыі гэтай вёскі ўжо не ведаюць. Яшчэ шырэйшым колам расходзіцца ідыёма «Суродаваў, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бог чарапаху». На гэтым прыкладзе навочна дэманструецца той працэс кандэнсацыі, згортванні сюжэту да матыву, а матыву да прымаўкі, фразеалагізма, аб якім пісаў М. І. Талстой у артыкуле «Этналінгвістычныя аспекты славянскай фразеалогіі» [17, 373 – 383].

**Спіс літаратуры:**


1. Березкин, Ю.Е. Мир черепахи: от детских рассказов до космогоний (в связи с оберегом из североамериканской коллекции МАЭ) / Ю.Е. Березкин // Сб. МАЭ. – 2005. – Т. 50. СПб.: Музей антропологии и этнографии РАН (Кунсткамера). – С. 251–279.
2. Грицер, П.А. Аватара / П.А. Грицер // Мифы народов мира : Энциклопедия. – Т. 1. – М. : Сов. энцикл., 1991. – С. 24-25.
3. Эрмин, В.Г. Индуистская мифология / В.Г. Эрмин // Мифы народов мира : Энциклопедия. – Т. 1. – М.: Сов. энцикл., 1991. – С. 536.
4. Шаракшинова, Н.О. Мифы бурят / Н.Ю. Шаракшинова. – Иркутск : Вост.-Сиб. кн. изд-во, 1980. – С. 26.
5. Черепахи в восточных мифах и легендах // [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.cherepahi.ru/4fun/mif1.htm. – Дата доступа : 13.03.2012.
6. The Portable North American Indian Reader. – N. Y., 1977. – P. 37. [Цыт. па Евсюков, В.В. Мифы о вселенной. – Новосибирск : Наука, 1988].
7. Легенды і паданні / склад. М.Я. Грынблат і А.Я. Гурскі. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – С. 35-37.
8. Кузнецова, В.С. Дуалистические легенды о сотворении мира в восточнославянской фольклорной традиции / В.С. Кузнецова. – Новосибирск : Изд-во СО РАН, 1998. – 250 с.
9. Тресиддер, Дж. Словарь символов // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.psyinst.ru/library.php?part=article&id=1153. – Дата доступа: 15.04.2012.
10. Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. – М. : Индрик, 1997. – С. 393–394.
11. Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер’і. Кніга 1 / уклад. У. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1996. – С. 31–32.
12. Боганева, А.М. Народная проза Брэсцкага Палесся / А.М. Боганева // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Т. 4. Брэсцкае Палессе: у 2-х кн. Кн. 2. – Мінск : Выш. шк., 2009. – С. 373.
13. «Народная Библия»: восточнославянские этиологические легенды / сост. и коммент. О.В. Беловой. – М.: Индрик, 2004. – С. 161.
14. Чубинский, П. Мудрість віків / П. Чубинский. – Киів, 1995. – Кн. 1. – С. 70.
15. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – С. 317 – 318.
16. Архіў аўтара.
17. Толстой, Н.И. Этнолингвистические аспекты славянской фразеологии / Н.И. Толстой // Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике. – М. : Индрик, 1995. – С. 373–383.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ